некоторым темам дается материал, выходящий за рамки школьной программы). Выполнение блока упражнений тестового и не тестового характера способствует формированию всех видов умений и навыков слушателей.

Проведение контрольных мероприятий – неотъемлемая часть данной работы, поскольку позволяет выявить динамику роста знаний, решить возникающие в ходе работы проблемы, откорректировать (в случае необходимости) процесс обучения. Задания текущего и итогового контроля включают важнейшие понятия и правила, которые необходимо знать слушателю. Обязателен и последующий подробный разбор заданий и анализ ошибок, допущенных слушателями для проведения в последующем работы по коррекции и устранению пробелов в знаниях.

Таблица 1 – Сравнительный анализ результатов ЦТ по русскому языку

| Ф.И.О. слушателя | Результат ЦТ 2017 г. (русский язык) | Результат ЦТ 2018 г. (русский язык) |
|---|---|---|
| Циринский В.Р. | 26 | 56 |
| Владысик Е.В. | 24 | 70 |
| Кириллова А.В. | 57 | 82 |
| Ильящук А.А. | 43 | 81 |
| Чемко В.В. | 15 | 54 |

Таким образом, коммуникабельность и готовность к сотрудничеству – вот что должно отличать современную личность, поэтому учреждения образования, в том числе и довузовской подготовки, призваны развивать способность к самореализации личности в новых социально-экономических условиях, формировать умение адаптироваться к различным жизненным ситуациям. Учебный процесс при этом представляет собой сотрудничество равных партнеров и направлен на активизацию внутренних резервов обучаемого и организацию учебной деятельности.

***У. А. Бобрык, Л. П. Дземідзенка***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС “БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ”

Электронны вучэбна-метадычны комплекс – гэта праграмны мультымедыяпрадукт навучальнага прызначэння, перавагай якога з’яўляецца магчымасць згрупаваць матэрыял, які ўключае ў сябе праграмы лекцый і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

практычных заняткаў, тэмы рэфератаў, праграмы экзаменаў і залікаў, а таксама метадычныя рэкамендацыі студэнтам па асваенні навучальных дысцыплін, спісы рэкамендуемай літаратуры. Прадстаўленне матэрыялу ў прэзентацыйнай форме дае магчымасць стымуляваць прадметна-вобразную памяць у студэнтаў, іх пазнавальную і творчую актыўнасць, дазваляе павялічваць каэфіцэнт засваення навучальнага матэрыялу і цікавасць студэнтаў да пэўнага прадмета.

На сучасным этапе пераходу да стандартаў новага пакалення, заснававным на модульных тэхналогіях, пытанне аб якасці арганізацыі самастойнай работы студэнтаў становіцца асабліва актуальным. Укараненне электронных вучэбна-метадычных комплексаў у працэс навучання стварае прынцЫпова новыя педагагічныя інструменты, даючы тым самым і новыя магчымасці. З дапамогай ЭУМК студэнты змогуць самастойна найбольш гнутка маніпуляваць прапанаванай вучэбнай інфармацыяй у адпаведнасці з іх індывідуальнымі здольнасцямі, пры гэтым частка навучальных функцый педагога пераходзіць на студэнта. Выкладчык толькі падтрымлівае студэнта, арыентуе ў патоках вучэбнай інфармацыі і дапамагае ў вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” накіраваны на грунтоўнае і дасканалае засваенне асноўных пытанняў беларускай дыялекталогіі, знаёміць з гісторыяй вывучэння ўсходнеславянскіх гаворак, асаблівасцямі беларускіх гаворак і адметнасцямі функцыянавання беларускіх гаворак у цяперашні час, фарміруе навыкі лінгвістычнага аналізу тэкстаў, запісаных у населеных пунктах Беларусі рэпрэзентантамі розных беларускіх гаворак.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” прызначаны для студэнтаў філалагічнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05-01 Беларуская філалогія (па напрамках): 1-21 05 01-01 Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць), 1-21 05 01-02 Беларуская філалогія (камп'ютарнае забеспячэнне).

Неабходнасць і актуальнасць дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыялістаў філалагічнага профілю абумоўлена дыферэнцыяцыяй дыялектных асаблівасцей і літаратурных моў, асаблівасцямі функцыянавання дыялектнай і літаратурнай моўных разнавіднасцей у сучаснай Беларусі.

Мэтай электроннага вучэбна-метадычны комплексу па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” з’яўляецца авалоданне студэнтамі асновамі беларускай дыялектнай мовы, яе лексічным багаццем.

Задачамі дапаможніка з’яўляюцца:

– засваенне шляхоў фарміравання літаратурнай мовы і роля канкрэтных дыялектаў у гэтым працэсе;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– фарміраванне навуковага падыходу да апісання фанетычнай, граматычнай сістэм дыялектнай мовы;

– аналіз дыялектных моўных з’яў, што знайшлі адлюстраванне ў сучаснай беларускай мове.

У выніку выкарыстання электроннага вучэбна-метадычны комплексу па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” студэнт павінен:

ведаць:

– групоўку тэрытарыяльных дыялектаў;

– асноўныя паняцці (ізаглоса, пучок ізаглос, лінгвістычны арэал);

– асаблівасці развіцця дыялектаў у розных гістарычных умовах;

– асноўныя слоўнікі дыялектнай лексікі, матэрыялы дыялекталагічнага і лексічнага атласаў беларускай мовы;

умець:

– вызначаць фанетычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці народных гаворак;

– дыферэнцыраваць дыялектныя асаблівасці і літаратурныя нормы;

– вызначаць групоўку гаворак на карце Беларусі, складаць ізаглосы распаўсюджвання тых ці іншых дыялектных з’яў.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” фарміруе наступныя кампетэнцыі спецыялістаў-філолагаў:

– правядзенне лінгвістычнага параўнальна-супастаўляльнага даследавання тэкстаў, запісаных у населеных пунктах Беларусі – рэпрэзентантамі розных беларускіх гаворак;

– выяўленне асноўных і дадатковых моўных асаблівасцей дыялектнага масіву беларускай мовы;

– вызначэнне прыналежнасці тэксту да пэўнай гаворкі беларускай мовы.

Вывучэнне электроннага вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў-філолагаў. Для засваення курса студэнт павінен валодаць дадзенымі па папярэдніх дысцыплінах: “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Сучасная беларуская мова: фанетыка, фаналогія, лексікалогія, фразеалогія”, “Гісторыя беларускай мовы”, “Стараславянская мова”. Курс “Беларуская дыялекталогія” становіцца асновай для далейшага засваення філалагічных дысцыплін “Стылістыка і культура мовы”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Сучасная беларуская літаратура”, якія паглыбляюць веды студэнтаў аб адметнасцях беларускай мовы і яе гаворак, іх функцыянаванні ў мастацкай літаратуры і мас-медыя і паказваюць стылістычныя магчымасці мовы, а таксама выяўляюць месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх і неславянскіх моў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Вывучэнне дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” адбываецца на 2 курсе філалагічнага факультэта спецыяльнасці 1-21 05 01 Беларуская філалогія (па напрамках) і разлічана на 82 гадзіны, з іх аўдыторных – 52, з якіх: лекцыйных – 24 гадзіны, практычных заняткаў – 24, кантралюемая самастойная работа – 4. Форма справаздачнасці – залік.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Беларуская дыялекталогія” складаецца з тлумачальнай запіскі, тэматычнага плану, зместу вучэбнага матэрыялу, тэарэтычнага і практычнага раздзелаў, пытанняў да заліку па дысцыпліне, спісу літаратуры.

Тлумачальная запіска вызначае мэты і задачы дапаможніка, указвае на сувязь з іншымі філалагічнымі курсамі.

Тэматычны план змяшчае назвы тэм і заняткаў, пералік вывучаемых пытанняў дысцыпліны “Беларуская дыялекталогія” і падае размеркаванне тэматыкі ўсяго курса паводле колькасці аўдыторных гадзін: лекцыйных, практычных заняткаў, самастойнай кантралюемай работы. Таксама ў тэматычным плане прапануюцца формы кантролю ведаў.

Змест вучэбнага матэрыялу прапануе асноўныя тэмы курса, якія знаёмяць з асноўнымі накірункамі і тэндэнцыямі беларускай дыялекталогіі. Матэрыял падзяляецца па тэмах і выкладаецца паводле выдзеленых у кожнай тэме пытанняў. Практычны раздзел арыентаваны на замацаванне тэарэтычных звестак і складаецца з тэматыкі і матэрыялаў практычных заняткаў, заданняў для самастойнай работы, пытанняў для праверачных кантрольных работ.

У матэрыялах практычных заняткаў указваецца ход правядзення практычных заняткаў, які складаецца з асноўных пытанняў адпаведнай тэмы курса.

Грунтоўнаму засваенню пытанняў курса паспрыяе выкананне студэнтамі заданняў для практычнай работы, размеркаваных па варыянтах. Заданні ўтрымліваюць практыкаванні па лінгвістычным аналізе тэкстаў, запісаных у населеных пунктах Беларусі – рэпрэзентантамі розных беларускіх гаворак.

У спісе літаратуры размяшчаюцца асноўныя і дадатковыя навуковыя крыніцы вывучэння дысцыпліны, выданні айчыннай і замежнай навуковай літаратуры, прысвечанай пытанням тэорыі і практыкі перакладу.

Электронны вучэбна-метадычны комплекс “Беларуская дыялекталогія” мае гіперспасылкі, па якіх карыстальніку прасцей арыентавацца ў вучэбна-метадычным комплексе, знаходзіць неабходныя адпаведныя раздзелы і тэмы курса і вяртацца да зместу.

Такім чынам, электронны вучэбна-метадычны комплекс “Беларуская дыялекталогія” ў цэласным фармаце з’яўляецца сродкам кіравання і самакіравання, стымулявання і падтрымкі, кантролю і самакантролю разнастайных відаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў, а яго выкарыстанне ў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адукацыйным працэсе дапамагае студэнтам стварыць цэласны малюнак вывучаемай дысцыпліны.

***В. В. Богуш***
*г. Гомель, ГФ «Международный университет «МИТСО»*
***А. И. Богуш***
*г. Гомель, БТЭУПК*

# КЛАСТЕРНЫЙ ПОДХОД В РАЗВИТИИ НАЦИОНАЛЬНЫХ ИННОВАЦИОННЫХ СИСТЕМ

В условиях глобализации и интернационализации рынков одной из приоритетных задач для современной системы образования Республики Беларусь является подготовка специалистов на основе кластерного подхода, позволяющего интегрировать в единое целое образование, науку и производство. Как показывает мировой опыт, кластерная организация сотрудничества дает возможность обеспечить высокий уровень и опережающий характер подготовки специалистов по перспективным направлениям экономики, повысить качество образования и эффективность научных исследований, развивать коммерческий и некоммерческий трансфер технологий.

Кластером можно считать систему особого вида, которая обладает достаточно высокой производительностью, устойчивостью к внешним воздействиям и может легко модернизироваться и укрупняться. Кроме системности, кластерная организация сотрудничества обладает признаком синергетичности. Именно синергетика объясняет действие механизмов, их самоорганизации, самореализации и саморазвития.

Являясь территориально-хозяйственной системой, кластеры, как социально-экономическое явление имеют свои преимущества и недостатки. В качестве основных преимуществ кластеров следует выделить глобальный масштаб, открытость, гибкость и относительную простоту в управлении. Это позволяет экономить ресурсы участников кластера за счет их совместных действий, координировать эти действия по согласованным направлениям, упрощать доступ к коммерческой информации и деловому опыту участников кластера, продвигать коллективные интересы участников кластера на рынке. К недостаткам кластерной организации сотрудничества следует отнести относительную сложность координации деятельности и согласования интересов участников кластеров, возникновение угрозы утраты уникальных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ